**Ала Пісарэнка**



# Скрынка з лістамі

**Загадчык кафедры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў**

***

**СКРЫНКА З ЛІСТАМІ**

Ноччу вецер лагодна гартаў лісты за акном – перачытваў, а пад самую раніцу так усхадзіўся, так завірыў, што раз-пораз стукаў мне, незадаволены гэтымі лістамі, у шыбы, нібы настойліва запрашаў пачытаць разам.

... І я мусіла выйсці насустрач шэрай раніцы. Змяла лістоту з ганка, зазірнула ў адчыненую паштовую скрыпку, а там – лісты... Сябры пішуць усё радзей, а то і зусім не пішуць. Тэлефоны, бачыш, эканомяць іх час. Але толькі нямыя лісты і паштоўкі гавораць з намі галасамі сяброў нашых праз гады.

Саджуся на лаўку, трымаючы ў руках сваю восеньскую пошту. А вецер ужо суцішана шэпча сухімі лістамі: не спяш-ш-айся, пач-ч-ытай...

Вось ліст кляновы, жоўты, з зялёнымі жылкамі – сведка паступовага згасання летняга харàства... Яшчэ многія дрэвы будуць трымаць сваё лісце, а клён адпускае... Гэтак жа і я рана адпусціла сваё першае і таму непаўторнае. Адпусціла лёгка, як дрэва адпускае жоўты ліст з першым моцным ветрам.

Клён рос каля возера, вялікі і моцны; там мы лавілі хрушчоў, садзілі ў маленькія каробачкі і, прыклаўшы да вуха, слухалі «радыё»... «Радыё» гудзела незадаволена, нецярпліва шкрэбла лапкамі – і мы яго выпускалі. Кожны дзень, калі ты выходзіў пагуляць да мяне і маёй сяброўкі, цябе клікала маці. Яе прарэзлівы голас і цяпер яшчэ рэжа з трэскам маю цішыню.

...Вось ліст дубовы, маленькі, карычневы, – адбітак сонечнай ласкі. Спаліла тая ласка цябе, лісток, заўчасна. Такая празмерная ласка заўсёды некага замучае, а то і зжыве зусім.

Дубы раслі ля калгаснага саду; дазорам акалялі яны грушы і паляну, перасыпаную купкамі чабору. А нам, малым, так хацелася тых сало-о-одзенькіх грушак! І ўдыхнуць таго траўнага водару, які, здаецца, і цяпер яшчэ кружыць мне галаву – кліча ў сад майго маленства...

Вось ліст рабіны. Ссох, скурчыўся, склаўся ў кулачок. На каго злуеш, даражэнькі? Злосць яшчэ нічога не ўпрыгожыла на гэтым свеце. Ды і на тым таксама.

...Рабіна расла каля хаты маёй сяброўкі; тады здавалася, што гарàць гронкі запрашальным полымем – «заходзь на агеньчык». А цяпер нібы сігналіць рабіна, як святлафор: чырвоны, значыць, няма ходу. Вось і думай цяпер сваёй галавой, а не чужой... Чужая галава так навучыла, што жывуць у тым доме іншыя людзі, а сяброўка тая ўжо не мая – чужая!..

Вось лісты з бярозкі, дробненькія, жоўценькія, – аскепкі летняга ценю ў восеньскім дыване... Іх можна сабраць, іх можна прыбраць, але не вяртаецца ліст на дрэва, як не вяртаецца кожны год і нават дзень і хвіліна, пражытыя намі.

Бяроза расла каля майго дома, яе садзіў бацька разам з маёй сястрой Галачкай. І кожную суботу, калі Галачка ўжо паступіла вучыцца, я чакала яе з горада каля гэтай бярозы... Беластволая так і ахоўвае маё першае жытло, успаміны пра якое ўсё яшчэ жывяць лажухлыя фарбы майго жыцця. А Галачка, як і раней, прыязджае, шкадуе – таксама ратуе душу маю самотную.

...Адкуль ты тут, ліст з таполі? Счарнелы і скурчаны, як прачытаная, спаленая і выкінутая паштоўка. Не ўчора, значыць, пакінуў галіну гэты ранні вандроўнік. Не дай Божа нікому рана пакінуць бацькоўскую хату па ўласным жаданні, а потым счарнець вось так, сумуючы па ёй...

Таполі растуць за бацькоўскім агародам. Адна вялізная, за тры разы не абхопіш, казалі, засталася яшчэ з панскага парку, астатнія, меншыя, абступаюць яе – слугуюць, як дзеці, удзячныя маці...

Лістоў «у таполях» насыпалася процьма, і я бегала па іх, прыслухоўваючыся да восені... Я спявала сабе. Я марыла аб далях... Потым мама клікала мяне – і я неслася, расставіўшы рукі самалёцікам, дадому.

Пакліч мяне, мамачка, і я кіну свае справы, як тыя жоўта-чорныя лісты, і прыбягу да цябе зноў...

***

Туды, у казку, на Раство,
Дзе снегу шэпт
І елак харàство,
Дзе парасон нябёсаў
Дакрануўся да зямлі –
І зоры пакаціліся па свеце…
Куды мы з Вамі
У дзяцінсве не дайшлі:
Вядома, дзеці…
Туды, у казку, на Каляды,
Дзе свеціцца святая Радасць,
Туды, дзе нарадзіўся Бог,
Дзе кожны з нас яшчэ бярог
Душу другога…
Туды, дзе мама маладая



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Чакае Вас ля ганка строга.
Туды, у санцаросую дзяцінства казку,
Я Вас з сабою запрашаю зноў:
Прыходзьце, калі ласка,
Бо не бывае позна –
Ні на сяўбу, ні на жніво…

***

**ПЕРАДВЕРАСНЁЎСКАЕ**

Перакінулася на другую палову жніўня – і паліло. Ліло кожны дзень. Ліло як з вядра. Казалі людзі, што ў таго вядра, мусіць, дна няма.

Ліло ўжо тыдзень. Ліло, збіваючы першыя жоўтыя лісты, зрываючы пахкія пялёсткі апошніх летніх красак... Казалі людзі, што гэта пасля Іллі, што гэта «Ілля кінуў гнілля». Пыталіся: «Ці не выносілі на Іллю пад дождж дзяцей, каб не баяліся суроку...»

Сонца ці то спала, ці то блукала ў высокіх шэрых хмарах, якія азмрочвалі небадах. І толькі дзеці не зважалі на гэта: у кароткіх прамежках паміж дажджасыпамі яны чародкамі насіліся па вуліцах... Галасы іх звінелі далёка, па ўсёй вёсцы... Тыдзень яшчэ – і ў школу, а там ужо так не пабегаеш, так не паскачаш... Ды і вады ў лужынах будзе халоднай... І сонца, хоць і прачнецца, але не сагрэе.

Што ж ты спіш, сонца? Што ж ты спіш, месяц? Уставайце! Ганіце прэч дажджлівыя дні і рабінавыя ночы! Хутка ўжо разляцяцца дзеці і ўнукі ад бацькоў і дзядуль – і сціхне вуліцы вясковая восеньская і без дажджу. Дай Божа, каб толькі да першага свята ці да наступнага лета...

І раптам зашапацелі бярозы мокрымі кронамі – вецер залётаў, разрываючы хмары і праганяючы іх за далягляд. А сонца распляло свае косы; цёпла і моцна, бы на развітанне, яно абняло зямлю...

І зязззялі тады рабіны сваімі багатымі гронкамі...

І прыбраўся бруснічнік у зялёна-чырвоны жэмчуг...

І зарумяніліся малінаўкай сады...

І павыскоквалі дружна рознакаляровыя грыбныя шапачкі, берэцікі, капялюшыкі...

І пярэсты луг застракатаў сумна-вясёлымі конікамі...

І раптам упаў першы жолуд – на восень павярнула...

***

І моліцца за ўсіх,
Хто хату помніць,
Страха,
Далоні склаўшы малітоўна…
*Р. Барадулін*

Страха далоні склала малітоўна:
Не ад'язджайце, дзеткі!
Тут жывіце!..
І вочы бацькавы ўспомняцца раптоўна,
І сінія валошкі ў жоўтым жыце…
І пах на Троіцу зялёнага аеру…
І буслаў клёкат,
як калыханка буслянятам…
А мама клікала і кліча
на вячэру!..
Як хочацца дамоў!
Як хочацца дахаты!
Страха далоні склала малітоўна…
і сваякі завуць, завуць сяброў
усмешкі…

Святі мне, сонца,
Святі мне, поўня,
Каб не забылася дадому сцежкі!

***

Дзічка-дзічка, чаму ты не груша?
*А. Разанаў*

Жыла-была дзічка.
Расла-была дзічка.
За плотам, ля саду.
Вясною сурвэткаю белаю
Заманьвала пчолак
За стол меданосны!
Улетку хавала мяне
Ад сонца чужога
У поўдзень млосны.
А ў вечар восеньскі,
Росны і ранні,
Мой сын тут прызначыць
Суседскай унучцы
Спатканне.
…Зіма як настане,
Мяцеліца ў вальсе
Ля грушкі той кружыцца,
Ды дрэмле мая вясковая,
Зімовая,
Самотная вуліца.
Спіць з вечара
Па самае цёмнае ранне.
Жыла-была дзічка…
Раніца. Дзень. Вечар…
Світанне.

***

**ШАГАЛУ І ВІЦЕБСКУ**

Альтанка,
Агароджаная калюжамі,
Абвітая ружамі,
Зашклёная ліўнем,
Зноў лятала над садам,
Кружыла над возерам,
Спявала над горадам,
Раскідваючы зіхоткія кроплі,
Рассяваючы ружовыя пялёсткі,
Рассыпаючы чароўныя гукі.
Я бачыла…
Я чула…
Я дакранулася…
А Вы?!.

Душу другога…
Туды, дзе мама маладая
Чакае Вас на ганку строга.
Туды, у сонцаросую дзяцідства казку,
Я Вас з сабою запрашаю зноў:
Прыходзьце, калі ласка,
Бо не бывае позна
Ні на сяўбу, ні на жніво…

**Summary**

Author's literary material for the year of the small Motherland.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ